**29 кастрычніка 2022 г. – 100 гадоў з дня нараджэння СЕМЯНЮК КАЦЯРЫНЫ ДЗЯМ’ЯНАЎНЫ (1922-2013), ветэрана Вялікай Айчыннай вайны і педагагічнай працы, заслужанага настаўніка БССР**



Кацярына Дзям’янаўна Рабчынская (па мужу – Семянюк) нарадзілася 29 кастрычніка 1922 года ў в. Кочышчы Ельскага раёна Палескай (цяпер Гомельскай) вобласці ў шматдзетнай сялянскай сям'і. Сваёй маці Кацярына амаль не памятала – яна памерла ў маладым узросце. Усе клопаты па гаспадарцы дзеці дзялілі з бацькам.

Прозвішча Рабчынскіх добра вядома ў Кочышчах, галоўным чынам дзякуючы бацьку - Дзям'яну Андрэевічу Рабчынскаму, удзельніку грамадзянскай вайны, арганізатару першых калгасаў на Ельшчыне. Быў старшынёй калгаса, за атрыманы высокі ўраджай бульбы быў накіраваны на Усесаюзную сельскагаспадарчую выставу ў Маскву. Дзед Кацярыны Андрэй у свой час быў адзіным адукаваным чалавекам на ўсю вёску, пісаў па просьбе аднавяскоўцаў лісты, прашэнні, карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод сялян.

Нялёгкі час выпаў на іх долю, але жаданне вучыцца было вельмі моцным. У 1940 годзе пасля заканчэння школы і трохмесячных курсаў Кацярына Рабчынская пачала працаваць настаўнікам пачатковай школы ў в. Вязок Брагінскага раёна (1940-1941).

Вялікая Айчынная вайна прынесла Рабчынскім новыя беды і няшчасці. Кацярына разам з дзвюма сваімі сёстрамі (Ганнай і Марыяй) пайшла ў партызанскі атрад «Бальшавік». «З 22 жніўня 1941 г. па 18 студзеня 1944 г. – радавая брыгады № 37», – запісана ў яе пасведчанні партызана. Кацярыне даводзілася хадзіць у разведку і ў засады, быць сувязной, удзельнічаць у рэйкавай вайне.

Бацька Кацярыны быў арганізатарам падполля, партызанскім сувязным, расстраляны 30 мая 1942 года. Тры яго сыны – Міхаіл, Васілий і Пётр – ваявалі на франтах. Старэйшая дачка Алена расстраляна ў 1942 годзе. Дачка Ганна была партызанкай, у лютым 1943 года абрана першым сакратаром Ельскага падпольнага райкама ЛКСМБ. Самая малодшая дачка Марыя, якая вайну сустрэла ў 15 гадоў, таксама партызаніла, узнагароджана двума ордэнамі,

медалямі. «Гераічная сям’я» – так называецца прысвечаны сям’і Рабчынскіх артыкул у кнізе «Памяць. Ельскі раён» (2001).

За баявыя заслугі, мужнасць і адвагу Кацярына Семянюк узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіей», 11 юбілейнымі медалямі.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Кацярына Рабчынская – сакратар Ельскага райкама камсамола. Паступіла ў Мазырскі педагагічны інстытут, які скончыла на выдатна ў 1946 годзе. Пасля заканчэння інстытута па размеркаванні была накіравана ў Заходнюю Беларусь.

Кобрыншчына стала для яе другой радзімай. Тут яна выйшла замуж, узяўшы прозвішча мужа Семянюк, тут нарадзіліся яе дзеці - двайняты Ларыса і Анатоль. Яна вучыла пасляваенных школьнікаў, аддавала ім свае веды і цяпло сэрца. З 1946 па 1962 год працавала настаўнікам, намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце Залескай сярэдняй школы Кобрынскага раёна. У 1962-1985 гады працавала настаўнікам матэматыкі ў СШ № 1 (1962-1963), СШ № 5 (1963-1967), СШ № 2 (1967-1990) г. Кобрына.

За шматгадовую добрасумленную працу, дасягнутыя поспехі ў педагагічнай дзейнасці Кацярына Дзям’янаўна Семянюк узнагароджана шматлікімі граматамі, ордэнамі і медалямі. У 1948 годзе яе праца была адзначана першай узнагародай - знакам «Выдатнік народнай адукацыі». Пазней узнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства асветы СССР і ЦК прафсаюзаў (1968), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалём ««За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения В. И. Ленина». 2 кастрычніка 1970 года К. Д. Семянюк было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР». Імя К. Д. Семянюк занесена ў даведнік «Кто есть кто в Республике Беларусь» (2005).

Жанчына была добра вядома многім кабрынчанам сваёй педагагічнай працай, актыўнай жыццёвай пазіцыяй, успамінамі пра гады ваеннага ліхалецця. Строгая і патрабавальная, сумленная і прынцыповая, валявая і энергічная, яна больш за 40 гадоў вучыла дзяцей матэматыцы.

Працяглы час Кацярына Дзям’янаўна актыўна ўдзельнічала ў хоры ветэранаў вайны і працы пры Доме культуры.

22 сакавіка 2013 года Кацярына Дзям’янаўна Семянюк памерла. Светлая памяць аб настаўніцы, патрыёце назаўжды застанецца ў гісторыі сістэмы адукацыі Кобрынскага раёна.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2022 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі*


**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. Семянюк Кацярына Дзям’янаўна // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Капач, М. А.** Гераічная сям’я : [пра Рабчынскіх] / М. А. Капач // Памяць. Ельскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2001. - С. 417–418.

**Семянюк Кацярына Дзям’янаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 292. - (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**Семенюк Екатерина Демьяновна** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. 2005 : к 60-летию Победы в Великой Отечественной войне : [в 2 т.] / под ред. И. В. Чекалова. - Минск, 2005. - Т. 2. - С. 311.

**Сіманава, І. Э.** Школьная адукацыя Кобрыншчыны ў даваенныя і першыя пасляваенныя гады / Ірына Сіманава // Карані і кроны: гісторыя Кобрыншчыны: першая палова ХХ стагоддзя / [укладальнікі : Ю. А. Барысюк, А. А. Мезенцэва]. - Брэст, 2017. - С. 108-134.

Гл. на с. 131.

**Заслужаны** настаўнік Беларускай ССР. Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь. **Семянюк Кацярына Дзям’янаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. - С. 112-113.

**100 гадоў з дня нараджэння К. Д. Семянюк (1922)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 57.

**Семенюк** Екатерина Демьяновна : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 2013. – 3 красавіка. – С. 2.

Е. Д. Семенюк - заслуженный учитель БССР, ветеран войны и педагогического труда.

**Дворецкий, М.** Отважная партизанка / Моисей Дворецкий // Заря. – 2012. – 30 июня. – С. 4.

За мужество и отвагу Е. Д. Семенюк награждена орденом Отечественной войны II степени, медалями «Партизан Великой Отечественной войны», «За победу над Германией».

**Шевченко, А.** Юность, опаленная войной… / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2007. – 10 мая. – С. 3.

О Семенюк Екатерине Демьяновне.

**У вайны** не жаночы твар // Кобрынскі веснік. – 2003. – 8 мая. – С. 1.

Аб ветэранах вайны А. І. Беразнёвай, сувязной партызанскага атрада імя Чапаева і К. Д. Семянюк, партызанкі атрада «Бальшавік».

**Гурда, В.** Когда Родина в опасности / Владимир Гурда // Заря. – 2002. – 30 июля.

Имена кобринчанок Е. Д. Рабчинской (Семенюк) и Т. И. Самцовой, ветеранов войны, партизанок (у каждой орден Отечественной войны и по 11 медалей) занесены в энциклопедию «Кто есть кто в Республике Беларусь».

Кобрынскі раён
Кобрын
Семянюк Кацярына Дзям’янаўна
Партызаны
Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны
Настаўнікі
Заслужаныя настаўнікі